Народная Трыбуна 2017. - № 45. – 07 лістапада. – С. 1

# Песня пра Радзіму

*На абласным этапе рэспубліканскага конкурсу "Студэнт года", які прайшоў 5 лістапада ў Брэсце, яго фіналісты спявалі выключна пра Беларусь*




■ **Гонар і прыгажосць студэнцтва Берасцейшчыны: Аліна Осіпава (БрДУ імя А.С. Пушкіна), Алена Зіновік (ПалесДУ), Аляксандра Малаканава (БарДУ) і Марына Бяльчук (БрДТУ)** *(злева направа)*.

– Конкурс у першую чаргу накіраваны на раскрыццё творчага патэнцыялу студэнцкай моладзі, праяўленне сябе ў калектыве, атрыманне лідарскіх якасцей. Гэта пляцоўка для ўсебаковага развіцця моладзі, – адзначыў Віктар Іваноў, першы сакратар абласнога камітэта БРСМ, член журы.

Для паспяховага праходжання ўсіх этапаў удзельнікам абласнога тура конкурсу "Студэнт года" (так атрымалася – у фінале выступалі толькі дзяўчаты) неабходна было праявіць разнастайнасць сваіх здольнасцей. Яны прайшлі выпрабаванні эрудыцыяй, творчасцю і фантазіяй.

Пра сябе дзяўчаты расказвалі ў арыгінальных "Візітоўках", таленты прадэманстравалі ў творчым конкурсе, які смела можна назваць вакальным – прэтэндэнткі спявалі, нібы дамовіліся, выключна песні пра Беларусь. Камунікацыйныя навыкі студэнткі паказалі ў конкурсе аратарскага майстэрства, тэмай якога была "Мая спецыяльнасць – мая гарантыя будучага!". Уім дзяўчаты закранулі розныя аспекты будучай прафесіі, а галоўнае – прадэманстравалі сваё красамоўства. Інтэлектуальныя здольнасці канкурсантак журы выяўляла пры абароне маладзёжных праектаў, спартыўныя – пры выкананні пастановачнага нумара на тэму "Спорт – здаровы лад жыцця!". Акрамя гэтага кожная ўдзельніца вынесла на суд журы і гледачоў "Партфоліа" і відэаролік "Я – студэнт!". Як звычайна, не далі ўпасці градусу спаборніцтваў групы падтрымкі канкурсантак.

Ацэнкі выстаўлены, тытулы раздадзены, пераможцы названы. У намінацыі "За волю да перамогі" лепшай стала студэнтка БрДТУ Марына Бяльчук. Таксама карыстальнікі віртуальнай сеткі "Вконтакте" шляхам ґаласавання вызначылі Марыну пераможцай у намінацыі "Студэнт года-2014 ONLINE". Тытул "Гарманічная асоба" атрымала Аліна Осіпава, БрДУ імя А.С. Пушкіна. Лепшай "За ўменне ўвайсці ў вобраз" стала Алена Зіновік, Палескі дзяржаўны ўніверсітэт. Ну, а абсалютным пераможцам конкурсных выпрабаванняў абласнога этапа стала Аляксандра Малаканава з БарДУ. Менавіта яна прадставіць вобласць у рэспубліканскім фінале конкурсу, які адбудзецца ў студзені 2015-га – дарэчы, аб'яўленага Прэзідэнтам Беларусі Годам моладзі.

– Не скажу, каб моцна хвалявалася. Я ўпэўненая, спакойная і заўсёды ведаю, што ўсё будзе добра. Вопыт конкурсных спаборніцтваў маецца, жаданне і імкненне да перамогі ёсць. Будзем пакараць рэспубліку, – сказала Аляксандра.

**Сабіна ГАРАЕВА, "НТ".**